**Віталь Гарматны**
(Баранавічы)

# Вайсковыя асаднікі Палескага ваяводства і іх дзейнасць сярод мясцовага сялянства ў 1921-1939 гг.

Першым заканадаўчым актам, у якім справа ішла аб насаджэнні на „Крэсах Усходніх" вайсковага асадніцтва стаў праект правядзення аграрнай рэформы ад 10 ліпеня 1919 г., у аснове якога ляжаў праект парцэляцыі: стварэнне са свабодных зямель спецыяльнага фонду, які потым павінен быць разбіты на дробныя надзелы (парцэлы) для свабоднага продажу насельніцтву. Апошнім артыкулам вызначаўся „вайсковы аспект" (справа ішла аб салдатах польскай арміі, большасць якіх складалі былыя сяляне), а таксама становішча беззямельных і батракоў. Аднак у законе не былі акрэслены памеры зямельнага надзелу, структура і прынцыпы надзялення зямлёю, параметры кандыдатаў. Аграрная рэформа 1919 г. насіла дэкларатыўны характар, яе рэалізацыі не адбылося, што выклікала недавер да ўлад сярод насельніцтва, пачалося дэзерцірства з арміі[1].

Яшчэ падчас заканчэння савецка-польскай вайны 1919-1920 гг. у сваім распараджэнні ад 18 кастрычніка 1920 г. „Вайсковы Начальнік" Юзаф Пілсудскі абяцаў сваім салдатам: „Айчына Вас не забудзе. Зямля, засеяная крывавым семем вайны, чакае севу спакою, чакае тых, хто меч зменіць на лямеш"[2]. Пілсудскі заклікаў салдат праявіць у працы такую ж адвагу, як і на вайне, абяцаў ім даць зямлю ў тых месцах, дзе яны раней ваявалі: „Кожны салдат павінен атрымаць заваяваную ім зямлю".

15 ліпеня 1920 г. падчас асаблівай небяспекі, калі Чырвоная Армія стаяла пад сценамі Варшавы, Сейм Другой Рэчы Паспалітай нават без абмеркавання прыняў новы зямельны закон, у чацвёртым артыкуле якога заканадаўча афармляў становішча вайсковага асадніцтва. Набыць новы надзел зямлі маглі ўсе грамадзяне Польшчы, за выключэннем тых

[1] А. Ф. Вырастка, *Выпрацоўка заканадаўства ў II Рэчы Паспалітай і яго рэалізацыя*, [у:] *Заходні рэгіён Беларусі вачыма гісторыкаў і краязнаўцаў: зборнік навуковых артыкулаў*, Гродна 2006, с. 233.

[2] J. Stobniak-Smogorzewska, *Kresowe osadnictwo wojskowe 1920-1945*, Warszawa 2003, s. 17.

асоб, якія былі задзейнічаны ў справах супраць дзяржавы альбо з'яўляліся дэзерцірамі з польскай арміі. Згодна дваццаць дзевятаму артыкулу першынство ў набыцці зямлі адводзілася інвалідам польскай арміі, здатным да працы на зямлі, а таксама тым салдатам, якія доўгі час правялі на фронце або дабравольна пайшлі ў армію. Салдаты і асабліва інваліды атрымоўвалі шэраг ільгот пры набыцці зямлі ў параўнанні з іншымі катэгорыямі насельніцтва, для іх падтрымкі ствараўся спецыяльны крэдытны фонд, які спецыялізаваўся на выданні доўгатэрміновых крэдытаў з іпатэчным забеспячэннем.

Кошт зямельнага надзелу згодна трыццаць трэцяму артыкулу залежаў ад якасці глебы, ад кошту будынкаў, прадукцыйнага значэння зямлі, а таксама аддаленасці ад транспартных шляхоў і рынкаў збыту. Ацэнка зямельных надзелаў і вызначэнне кошту продажу зямлі былі вызначаны аднолькавымі для ўсіх катэгорый пакупнікоў.

Старшыня Савета Міністраў Другой Рэчы Паспалітай Вінцэнт Вітас 4 лістапада 1920 г. прадставіў маршалку Сейма праект двух узаемазвязаных законаў: першы датычыўся прыняцця зямлі ва ўласнасць дзяржавы ў шэрагу паветаў, якія знаходзіліся па-за Бугам, другі акрэсліваў сістэму надання зямлі заслужаным вайскоўцам. Праекты законаў былі перададзены на разгляд Сейма 10 лістапада 1920 г. і прыняты для разгляду камісіяй па аграрных справах. 9 снежня 1920 г. адбылося другое чытанне, а на трэцім чытанні 17 снежня 1920 г. польскі Сейм прыняў закон аб асадніцтве[3].

Фонд, з якога асаднікаў надзялялі зямлёю складаўся з казённых, галоўным чынам канфіскаваных царскім урадам у паўстанцаў 1863-1864 гг. памесцяў, памешчыцкіх грунтаў (пераважна памешчыкаў няпольскай нацыянальнасці, якія да 1 красавіка 1921 г. не вярнуліся ў свае маёнткі), зямель праваслаўнага духавенства (надзелы звыш 30 га)[4].

У распараджэнні старшыні Галоўнай зямельнай управы Рэчы Паспалітай ад 23 сакавіка 1921 г. тлумачыцца, каго закон разумеў пад салдатамі польскай арміі. Гэта радавыя і сяржанты, афіцэры і генералы, а таксама прыроўненыя да іх служачыя польскай арміі і падраздзяленняў добраахвотнікаў (апалчэнцаў), якія неслі вайсковую службу не менш чатырох месяцаў. Усе яны мелі права на бясплатнае надзяленне зямлёю на навадалучаных тэрыторыях. Згодна з законам не маглі атрымаць зямлі тыя салдаты, якія пакараны за злачынствы супраць узброе-

[3] А. Ф. Вырастка, *Выпрацоўка заканадаўства ў ІІ Рэчы Паспалітай...*, с. 233; W. Studnicki, *W sprawie osadnictwa na ziemiach wshodnich*, Warszawa 1922, s. 4-5.

[4] С. М. Грэсь, *Насаджэнне асадніцтва на землях Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг.*, [у:] *Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі, супярэчнасці, перспектывы развіцця. Матэрыялы рэспубліканскай навуковай канферэнцыі 3-4 мая 2002 г., г. Гродна. У 4 ч.*, ч. 4, Гродна 2003, с. 253.

ных сіл польскай дзяржавы, а таксама тыя, што самавольна бралі ў карыстанне чужыя землі[5].

У канцы 1924 г. урад В. Грабскага выступіў з новым законапраектам па аграрнаму пытанню. 26 ліпеня 1925 г. Сейм Рэчы Паспалітай пры падтрымцы партый ППС і ПСЛ „Вызваленне" адхіліў законапраект левых і прыняў шырокавядомы „Закон аб правядзенні зямельнай рэформы", які ўвайшоў у гісторыю пад назвай „Закон аб парцэляцыі і асадніцтве"[6]. 28 снежня 1925 г. Сеймам прыняты канчатковы варыянт аграрнай рэформы.

На падставе распараджэння Савета Міністраў Польшчы ад 23 сакавіка 1921 г. (Збор законаў Рэчы Паспалітай, 1921, № 30-178) дзеля правядзення аграрнай рэформы (у тым ліку і на тэрыторыі Палескага ваяводства), нагляду за стварэннем фонду свабодных ворных зямель, выдачы вайсковым і цывільным асаднікам надаўчых актаў на атрыманне „асад" (надзелаў сельскагаспадарчай зямлі) і г.д., стваралася Палеская акруговая дэлегатура з цэнтрам у горадзе Брэст-Бужскі (Брэсце).

Паўнамоцтвы дэлегатуры распаўсюджваліся на Брэст-Бужскі (Брэсцкі), Драгічынскі, Камень-Кашырскі, Кобрынскі, Косаўскі, Лунінецкі, Пінскі, Пружанскі, Сарненскі паветы (з 1929 г. у складзе Валынскага ваяводства) Палескага ваяводства. У сваёй дзейнасці Палеская акруговая дэлегатура падпарадкоўвалася Галоўнай зямельнай управе Другой Рэчы Паспалітай. Згодна распараджэнню Савета Міністраў Польшчы ад 20 сакавіка 1922 г. (Збор законаў Рэчы Паспалітай, 1922, № 41-345) Палеская акруговая дэлегатура перайменавана ў Палескае акруговае зямельнае ўпарадкаванне Галоўнай зямельнай управы з цэнтрам у г. Брэсце-Бужскім (Брэсце). Згодна з законам ад 11 жніўня 1923 г. (Збор законаў Рэчы Паспалітай, 1923, № 90-706) камісарыят перайшоў пад уладу Міністэрства сельскай гаспадаркі і зямельных рэформ[7].

Асноўная мэта, да якой імкнуўся ўрад Другой Рэчы Паспалітай падчас правядзення аграрнай рэформы на тэрыторыі Палескага ваяводства, заключалася ў тым, каб узняць з папялішчаў і аднавіць разбураную войнамі галоўную галіну эканомікі Другой Рэчы Паспалітай — сельскую гаспадарку[8], акрамя таго дзеля пасяховай каланізацыі новадалучаных зямель планавалася насадзіць на пустуючых землях Заходняй Беларусі

[5] А. А. Сорокин, *Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920-1939 гг.)*, Минск 1968, с. 69.

[6] *Historia chłopów polskich*, pod red. S. Inglota, Wrocław 1995, s. 215.

[7] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (далей: ДАБВ), ф. 60, воп. 1, спр. 1, арк. 1-2. Полесское окружное земельное управление Министерства сельскохозяйственных реформ.

[8] Z. Landau, J. Tomaszewski, *Polska w Europie i świecie 1918-1939*, Warszawa 1984, s. 154, 161.

вайсковых асаднікаў-каланістаў з ліку „легіянераў” — былых удзельнікаў савецка-польскай вайны 1919-1920 гг. Варта адзначыць, што засяленне беларуска-ўкраінскіх акраін польскімі каланістамі пачалося яшчэ ў 1920 г., калі гэтыя тэрыторыі былі акупаваны польскімі войскамі[9].

Польскі ўрад меркаваў з дапамогай вайсковых асаднікаў дасягнуць яшчэ некалькіх вельмі важных мэт:

1. Заахвоціць прызыўнікоў да добрасумленнай службы ў польскай арміі (вайскоўцы мелі магчымасць атрымаць надзел зямлі пасля адбыцця тэрміну службы ў арміі);
2. Сфарміраваць адзіную сістэму нацыянальнай эканомікі, у склад якой уваходзілі тэрыторыі, што да гэтага знаходзіліся ў складзе трох розных дзяржаў: Расійскай Імперыі, Германіі, Аўстра-Венгрыі;
3. Кантраляваць новастораную мяжу з Савецкім Саюзам;
4. Выкарыстаць вайсковых асаднікаў у выпадку вайсковай неабходнасці супраць савецкай улады ў якасці партызан;
5. Зменшыць зямельны голад у цэнтральных ваяводствах краіны;
6. Падтрымаць мясцовыя антысавецкія элементы, якія ў будучым можна было таксама выкарыстаць у выпадку вайны з Савецкім Саюзам.

У абавязак асаднікаў уваходзілі таксама збор звестак агентурнага характару, садзейнічанне ўладам пры аб’яўленні прызыву ва ўзброеныя сілы, арганізацыя варты для стратэгічна важных мастоў і чыгунак. Асаднікі гралі ролю запаснога ўзброенага атрада, гатовага ў выпадку неабходнасці выконваць некаторыя паліцэйскія функцыі[10].

Палескае ваяводства мела стратэгічна важнае памежнае значэнне, таму планавалася густа засяліць яго перасяленцамі з цэнтральнай Польшчы — каля 100 тысяч чалавек. Гэтая тэрыторыя здавалася кіраўніцтву Міністэрства ўнутраных спраў Польшчы найбольш „надзейнай” — прыдатнай для далейшай каланізацыі, бо мясцовае насельніцтва „не мела ніякай нацыянальнай свядомасці, палітычна малаарганізавана”, таму паспяховай каланізацыі на думку польскіх улад не павінна было нічога перашкодзіць[11].

[9] Ф. Я. Кон, *Западная Белоруссия — колония панской Польши (к процессу над белорусской громадой)*, Москва 1928, с. 13.

[10] А. Ф. Вырастка, *Выпрацоўка заканадаўства ў II Рэчы Паспалітай...*, с. 236; С. М. Грэсь, *Насаджэнне асадніцтва на землях Заходняй Беларусі...*, с. 253; Т. А. Калеснiковiч, *Памешчыцкая гаспадарка на тэрыторыі Камянецкага раёна ў міжваенны перыяд (1921-1939 гг.)*, [у:] *Моладзь Берасцейшчыны*, Брэст 2006, с. 96-97; А. А. Сорокин, *Аграрный вопрос в Западной Белоруссии...*, с. 72-73; J. Stobniak-Smogorzewska, *Kresowe osadnictwo wojskowe 1920-1945*, s. 263.

[11] Я. Міраноўіч, *Праекты інтэграцыі паўночна-ўсходніх „крэсаў” у палітычнай думцы санацыйнага лагера*, [у:] *Юзаф Пілсудскі ў гісторыі Польшчы і Беларусі. Матэрыялы міжнароднага беларуска-польскага навуковага семінара 5-6 красавіка 2002 г.*, Мінск 2002, с. 34.

З мэтаю падтрымкі вайсковых і цывільных асаднікаў, а таксама для іх лепшай каардынацыі, Міністэрства вайсковых спраў Польшчы пры падтрымцы ўрада пачынае ствараць грамадскія арганізацыі, у якіх галоўную ролю ігралі вайсковыя асаднікі. Самай буйной з іх стаў „Саюз былых абаронцаў усходніх ускраін" (які ў хуткім часе перайменавалі ў „Саюз асаднікаў")[12]. Узначальваў гэтую арганізацыю „Цэнтральны саюз асаднікаў" у Варшаве, а ў кожным заходнебеларускім ваяводстве стваралася яго аддзяленне, а таксама мясцовыя павятовыя аддзелы і пярвічныя арганізацыі. Членам „Саюза асаднікаў" мог стаць кожны поўнагадовы грамадзянін Другой Рэчы Паспалітай, які атрымаў „асаду" (надзел зямлі на „Крэсах Усходніх") ці мае права на яе атрыманне, поўнагадовыя члены яго сям'і, прадстаўнікі адміністрацыйнага апарату асады, а таксама тыя грамадзяне, дзейнасць якіх магла быць для асаднікаў каштоўнай. Прыём у арганізацыю праходзіў непасрэдна на з'ездах пры рэкамендацыі павятовага аддзела і па пісьмовых характарыстыках двух членаў „Саюза асаднікаў". У гэтую арганізацыю часта ўваходзілі таксама дзяржаўныя служачыя валасных і павятовых устаноў, леснікі і г.д.

Званне ганаровага члена арганізацыі прысуджалася рашэннем Агульнага сходу „Саюза" па рэкамендацыі Галоўнай управы. Першым ганаровым членам „Саюза" асаднікі абралі Юзафа Пілсудскага[13]. Сам Юзаф Пілсудскі як „першы салдат адроджанай Польшчы" атрымаў у падарунак ад буйных магнатаў маёнтак Святнікі (Віленская губерня)[14], такім чынам Пілсудскі стаў „Асаднікам № 1" — іх апораю і надзеяй.

14 верасня 1922 г. старшыня „Цэнтральнага саюза асаднікаў" у Варшаве звярнуўся ў Палескую ваяводскую ўправу з просьбай аказаць падтрымку ў стварэнні ваяводскага аддзела „Саюза" ў сувязі з тым, што „Саюз асаднікаў" займае важнае месца ў абароне інтарэсаў Польшчы на „Крэсах Усходніх" і ўзмацненні тут польскага элементу. На працягу 1922 г. у Палескім ваяводстве створана сетка павятовых арганізацый „Саюза асаднікаў" — адным з першых яшчэ ў чэрвені 1922 г. створаны аддзел Брэст-Бужскага (Брэсцкага) павета, які размяшчаўся па адрасе: г. Брэст-Бужскі, вул. Садовая, 37а. На момант стварэння аддзела ў павеце налічвалася каля 650 членаў гэтай арганізацыі.

[12] В. Минаев, *Западная Белоруссия и Западная Украина под гнётом панской Польши*, Москва 1939, с. 24.

[13] В. Утгоф, *Общественные организации осадников и их деятельность на территории Полесского воеводства (1921-1939 гг.)*, [у:] *Беларусь і Польшча ў XX стагоддзі: агульнае і адметнае ў гістарычных лёсах. Матэрыялы міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі. Брэст, 7-8 красавіка 2000 г.*, Брэст 2001, с. 143.

[14] А. А. Сорокин, *Аграрный вопрос в Западной Белоруссии...*, с. 76; J. Stobniak-Smogorzewska, *Kresowe osadnictwo wojskowe 1920-1945*, s. 120.

Ва Уставе „Саюза асаднікаў” сфармуляваны наступныя мэты і задачы будучай дзейнасці вайсковых асаднікаў:

1. Стварэнне ўмоў дзеля далейшага развіцця дзяржаўнай незалежнасці, развіцця краіны і дасягнення ёю магутнага становішча ў свеце;
2. Праца над павышэннем узроўню развіцця гаспадаркі краіны, асабліва „Крэсаў Усходніх”;
3. Выхаванне народных мас як свядомых грамадзян краіны;
4. Рацыянальная перабудова зямельнага карыстання;
5. Апека над вайсковымі і цывільнымі асаднікамі, выхаванне ў іх пачуцця сваіх абавязкаў і правоў у адносінах да дзяржавы;
6. Абарона інтарэсаў вайсковых і цывільных асаднікаў пры правядзенні зямельнай рэформы і рассяленні асаднікаў.

Асноўнымі напрамкамі сацыяльна-эканамічнай і грамадска-палітычнай дзейнасці „Саюза асаднікаў” у разглядаемы перыяд сталі:

1. Культурна-асветніцкая і гаспадарчая дзейнасць як сярод членаў саюза, так і сярод мясцовага насельніцтва, пры ўмове супрацоўніцтва з іншымі грамадска-палітычнымі арганізацыямі;
2. Арганізацыя розных курсаў, школ, бібліятэк, народных дамоў;
3. Супрацоўніцтва з сельскагаспадарчымі арганізацыямі, даручаючы ім клопат аб гаспадарчай дзейнасці асаднікаў;
4. Правядзенне розных спартыўных спаборніцтваў;
5. Арганізацыя акцый самадапамогі;
6. Стварэнне свайго друкаванага органа[15].

Вялікая ўвага ў „Саюзе асаднікаў” адводзілася гаспадарчаму жыццю вайсковых асаднікаў. На штогадовых павятовых і ваяводскіх сходах разглядаліся эканамічныя праблемы і прымаліся пастановы па іх вырашэнні — у сувязі з тым, што салдаты (асноўную частку якіх складалі сяляне) доўгі час былі адарваны ад зямлі і страцілі сельскагаспадарчую кваліфікацыю, польскія ўлады стваралі спецыяльныя курсы, на якіх будучых каланістаў вучылі асновам капіталістычнага вядзення сельскай гаспадаркі.

Урад Рэчы Паспалітай ставіў перад сабою таксама мэту заахвоціць вайсковых асаднікаў да ўдзелу ў самакіраванні, таму „Цэнтральны саюз асаднікаў” у Варшаве праводзіў 6-тыднёвыя курсы самакіравання, у праграму якіх уваходзілі як гуманітарныя, так і спецыяльныя прадметы. Пасля заканчэння курсаў выпускнікам выдавалася пасведчанне.

На месцах ствараліся розныя гурткі і арганізацыі — „Кулка рольнічэ”, „Каса Стэфчыка”, „Саюз землеўласнікаў”, „Саюз афіцэраў запасу”, „Саюз легіянераў”, „Стшэлец”, „Саюз сельскай моладзі” і іншыя, дзе галоўную ролю ігралі асаднікі: яны вучылі сялян новым — капіта-

[15] В. Утгоф, *Общественные организации осадников...*, с. 144.

лістычным — метадам вядзення сельскай гаспадаркі, арганізоўвалі спартыўныя спаборніцтвы, тэатральныя і музычныя прадстаўленні, школы і бібліятэкі, народныя дамы[16]. Напрыклад, да работы ў „Саюзе стральцоў” („Стшэлец”) актыўна заахвочвалася мясцовая моладзь, асаблівая ўвага адводзілася культурна-асветніцкай і спартыўнай дзейнасці: праводзіліся ваенізаваныя вучэнні, паказальныя выступленні, прымеркаваныя да памятных дат і дзяржаўных свят.

Трэба адзначыць, што вельмі хутка вайсковыя асаднікі пачалі арганізоўваць „Колы гаспадынь вейскіх” (арганізацыі вясковых гаспадынь), першае з якіх на тэрыторыі Палескага ваяводства створана ў лістападзе 1923 г. у Касаўскім павеце[17]. У адпаведнасці са Статутам „Кола гаспадынь” 1930 г. мэтай працы арганізацыі стала „аб'яднанне вясковых гаспадынь для правядзення арганізаванай грамадскай работы, заснаванай на ідэях сацыяльнай і прафесійнай дапамогі шляхам павышэння ўзроўню прафесіянальных ведаў і культуры вядзення гаспадаркі”. Удзельнічаць у рабоце „кола гаспадынь” магла любая сялянка, незалежна ад узросту, месца пражывання, маёмаснага становішча, нацыянальнасці і веравызнання.

У сувязі з тым, што ветэраны (асноўную частку якіх складалі былыя сяляне) доўгі час з-за войн былі адарваны ад зямлі і страцілі сельскагаспадарчую кваліфікацыю (многіх з іх яшчэ зусім маладымі людзьмі прызвалі ў рускую ці аўстра-венгерскую армію ў пачатку жніўня 1914 года), польскія ўлады стваралі для іх спецыяльныя курсы, на якіх будучых каланістаў вучылі асновам капіталістычнага вядзення сельскай гаспадаркі.

Для вызначэння зямель, якіх можна будзе адвесці пад асады, ствараліся сумесныя камісіі з прадстаўнікоў міністэрстваў рольных рэформ, фінансаў, вайсковых спраў. Галоўнымі крытэрыямі пры адборы зямлі пад надзелы сталі якасць і колькасць свабодных зямель, а таксама аддаленасць ад шляхоў зносін і адміністрацыйных цэнтраў. Так, прадстаўнік Міністэрства вайсковых спраў паручнік Лявон Грушніцкі 26-27 кастрычніка 1922 г. ездзіў у маёнтак Толшча Высока-Літоўскай гміны Брэсцкага павета для агляду зямель пад асады — дзяржава кампенсавала яму кошт чыгуначнага білета ў 1000 марак, а таксама праезд амнібусам ад станцыі да месца прызначэння ў 400 марак[18]. Кожнаму каланісту выпісвалася пасведчанне і выдаваўся асаблівы знак вайсковага асадніка. Асаднікамі станавіліся нават і генералы — адзін з бліжэйшых

[16] Л. Гак, *Аграрная палітыка польскай буржуазіі ў Заходняй Беларусі*, Мінск 1933, с. 48.

[17] J. Stobniak-Smogorzewska, *Kresowe osadnictwo wojskowe 1920-1945*, s. 240.

[18] ДАБВ, ф. 60, воп. 1, спр. 6, арк. 32. Заявления военных осадников о выдаче ссуды.

паплечнікаў Ю. Пілсудскага генерал Жалігоўскі па вельмі нізкім кошце набыў у Драгічынскім павеце звыш 500 га зямлі[19].

Большасць асаднікаў атрымлівала ў Палескім ваяводстве па нізкім кошце ці наогул бясплатна па 15-45 га зямлі ў залежнасці ад вайсковых заслуг і звання: па агульнапрынятаму правілу палкоўнік атрымоўваў 30 гектараў зямлі, капітан — 20, паручнік — 15, радавы — каля 9-10 га, але былі і такія асаднікі, якія атрымалі толькі па 3-5 гектараў зямлі[20].

**Табліца № 1: Размеркаванне асаднікаў Палескага ваяводства па памерах зямельных надзелаў (на 1932 г.)**[21]

| да 5 га | 5-10 | 10-15 | 15-20 | 20-25 | 25-30 | 30-35 | усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2,2% | 0,1% | 5,0% | 17,8% | 38,4% | 21,2% | 15,3% | 1133 |

Дзеля атрымання зямлі асадніку неабходна было знайсці двух паручэнцаў, якія б неслі фінансавую адказнасць у выпадку яго неплацежаздольнасці[22]. Здараліся і унікальныя выпадкі: у маёнтак Баравікі Косаўскай гміны Косаўскага павета перасялілася з Кракаўскага ваяводства сям'я вайсковага асадніка Францішка Стылінскага. Бацька атрымаў 44,79 га зямлі, а ягоныя сыны: Мар'ян — 25,03 га і Ян — 24,69 га. Пры гэтым бацька з сынамі выступілі паручэнцамі адзін аднаго. Яны сумесна вялі гаспадарку — валодалі шматлікімі прыладамі працы, вялікай колькасцю сельскагаспадарчай жывёлы і птушак, кожны з іх уносіў на свой надзел больш чым тону ўгнаенняў, што забяспечвала ім добры ўраджай[23].

Пры надзяленні зямлёю асаднікаў польскія ўлады ўлічвалі ў першую чаргу іх вайсковыя заслугі і лаяльнасць да польскага панавання на новадалучаных землях, і толькі ў другую на іх здольнасць займацца сельскай гаспадаркай. Многія вайсковыя асаднікі Палескага ваяводства былі

[19] И. В. Полуян, *Западная Белоруссия в период экономического кризиса 1929-1933 гг.*, Минск 1991, с. 37; А. А. Сорокин, *Аграрный вопрос в Западной Белоруссии...*, с. 73-74.

[20] С. М. Грэсь, *Насаджэнне асадніцтва на землях Заходняй Беларусі...*, с. 253; П. І. Зялінскі, *Аграрная рэформа ў Заходняй Беларусі (1919-1939 гг.)*, [у:] *Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць. Матэрыялы міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі 17-18 верасня 1999 г.*, Мінск 2000, с. 26-27.

[21] J. Stobniak-Smogorzewska, *Kresowe osadnictwo wojskowe 1920-1945*, s. 112.

[22] ДАБВ, ф. 60, воп. 1, спр. 127, арк. 11. Дело о выдаче ссуды военному осаднику Бальцеру Анджею; П. І. Зялінскі, *Аграрная рэформа ў Заходняй Беларусі...*, с. 27.

[23] ДАБВ, ф. 60, воп. 1, спр. 77, арк. 63. Заявления военных осадников о выдаче ссуд.

добра вядомыя сваёй храбрасцю і мужнасцю, праяўленымі на фронце падчас савецка-польскай вайны 1919-1920 гг. — напрыклад, асаднік Ялінскі (асада Сялец Пружанскага павета) за свае подзвігі ўзнагароджаны чатырма польскімі ордэнамі „Virtuti Militari" („Крыжа мужнасці")[24].

Памер аплаты за зямлю прыроўніваўся да 30-100 кг збожжа за 1 га штогод з выплатай дзяржаве на працягу 30 гадоў, пачынаючы з пятага года пасля атрымання зямлі. Дзяржава аказвала дапамогу натурай або грашыма для абзавядзення гаспадаркай. Асаднік павінен на працягу года пасяліцца на сваім водрубе і ў трохгадовы перыяд асвоіць яго[25].

Згодна закону ад 17 снежня 1920 г. на аднаго каланіста на абзавядзенне гаспадаркай польскім урадам выдзяляліся:

1. Адна пара коней з вупражжу і воз пасля дэмабілізацыі асадніка;
2. 80 кубічных метраў дрэва і іншыя неабходныя матэрыялы для пабудовы хаты і гаспадарчых пабудоў;
3. Крэдыт на 50 000 марак (1921 г.) на стварэнне гаспадаркі;
4. Крэдыт на будаўніцтва па прашэнню асадніка, якое разглядалася мясцовым павятовым надаўчым камітэтам для вызначэння памераў неабходнай дапамогі[26].

Будаўнічы матэрыял — цэгла, цэмент, жалеза, шкло і г.д., жывы інвентар для заслужаных салдат польскай арміі, інвалідаў, а таксама добраахвотнікаў выдаваліся бясплатна. Для ўсіх астатніх катэгорый асаднікаў дапамога была платная, за выключэннем будаўнічага матэрыялу. Увесь працэс па надзяленні зямлёю асаднікаў ускладаўся на павятовы надаўчы камітэт, а Міністэрства вайсковых спраў разам з вайсковымі аддзеламі дывізій і брыгад ажыццяўлялі тэхнічны падзел зямлі на часткі пад кантролем павятовага надаўчага камітэта і Галоўнай зямельнай управы[27].

Вайсковым каланістам для арганізацыі гаспадарак дзяржава выдзяляла коней, буйную рагатую жывёлу, свіней. Ужо ў пачатку 1923 г. для асаднікаў у Палескім ваяводстве выдзелена 128 тысяч гектараў: у Брэст-Бужскім павеце — 6 тыс. га, Пружанскім — 5,5 тыс., Драгічынскім — 8 тыс., Кобрынскім — 6 тыс., Косаўскім — 10 тыс. га і г.д. Толькі за 1922 г. вайсковыя асаднікі Брэст-Бужскага (Брэсцкага) павета атрымалі ад польскіх улад бясплатна 180 коней, 200 кароў, 90 авечак, 140 сві-

[24] А. Ф. Вырастка, *Выпрацоўка заканадаўства ў ІІ Рэчы Паспалітай...*, с. 236; М. А. Пейган, *Сяло ля Башты: гісторыя вёскі Сялец Бярозаўскага раёна*, Мінск 2003, с. 107.

[25] П. І. Зялінскі, *Аграрная рэформа ў Заходняй Беларусі...*, с. 27; J. Stobniak-Smogorzewska, *Kresowe osadnictwo wojskowe 1920-1945*, s. 54.

[26] J. Stobniak-Smogorzewska, *Kresowe osadnictwo wojskowe 1920-1945*, s. 64-65.

[27] А. Ф. Вырастка, *Выпрацоўка заканадаўства ў ІІ Рэчы Паспалітай...*, с. 236.

ней, 4000 пудоў збожжа для пасеву, 5000 пудоў бульбы і іншую матэрыяльную дапамогу[28].

Асаднікам праз Дзяржаўны банк выдаваліся ільготныя крэдыты звычайна пад 12% гадавых, але здараліся асобныя выпадкі, што некаторыя з іх не маглі своечасова выплаціць патрабуемыя сродкі[29]: так, у 1930 г. асаднік маёнтка Варацэвічы Іванаўскай гміны Драгічынскага павета Ісідор Ласковіч не здолеў своечасова выплаціць узятую пазыку з працэнтамі ў памеры 1073,33 злотых (пазыка № 232454). Банк абавязаў яго выплаціць гэтую суму на працягу двух наступных гадоў[30]. Для таго, каб папярэдзіць нерацыянальнае выкарыстанне грошай, выдзеленых на крэдыты, урадам устанаўліваліся праверкі гаспадарак. Пры выкарыстанні пазык не па прызначэнні асадніку пагражалі такія меры пакарання, як датэрміновае вяртанне грошай, ці, у выключных выпадках, канфіскацыя асады — толькі за 1930 г. у выніку такіх праверак 36 асаднікаў Брэсцкага павета пазбаўлена сваіх надзелаў[31].

Да 1 студзеня 1923 г. у Палескім ваяводстве атрымаў зямлю 991 асаднік. З іх 20-25% складалі афіцэры, прыкладна столькі ж — інваліды і легіянеры, якія асабліва вызначыліся ў савецка-польскай вайне[32], але трэба адзначыць, што далёка не ўсе асаднікі Палескага ваяводства змаглі арганізаваць сваю гаспадарку, таму некаторыя з іх прадалі зямлю і выехалі назад у Польшчу — у 1929 г. у Палескім ваяводстве налічвалася каля 900 асаднікаў, якія валодалі 128 тысячамі га ворнай зямлі.

Некаторыя вайсковыя асаднікі атрымоўвалі на тэрыторыі Палескага ваяводства па два і нават больш надзелаў: напрыклад, у Валовельскай гміне Драгічынскага павета надзелы № 19 і № 19а дасталіся Феліксу Следзю, а надзелы № 20 і № 22 — Феліксу Паўлоўскаму, надзелы № 4 і № 4а плошчай больш за 25 га атрымаў асаднік Жыгімонт Шляхетка[33].

Падбор асаднікаў і размеркаванне іх фактычна ажыццяўляў Генштаб. Пры надзяленні зямлёю асаднікаў, польскія ўлады ўлічвалі ў першую

[28] С. М. Грэсь, *Насаджэнне асадніцтва на землях Заходняй Беларусі...*, с. 254; Б. Е. Кухарев, *Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919-1939 гг.)*, Минск 1975, с. 31.

[29] П. І. Зялінскі, *Аграрная рэформа ў Заходняй Беларусі...*, с. 27.

[30] ДАБВ, ф. 60, воп. 1, спр. 158, арк. 5. Дело о наделении землёй военного осадника Ласковича Исидора 1930 г. имение Вороцевичи гмина Яновская повет Дрогичинский.

[31] Т. А. Калеснiковiч, *Памешчыцкая гаспадарка на тэрыторыі Камянецкага раёна ў міжваенны перыяд...*, с. 97.

[32] Ф. Я. Кон, *Западная Белоруссия — колония панской Польши...*, с. 17; А. А. Сорокин, *Аграрный вопрос в Западной Белоруссии...*, с. 77.

[33] У. В. Здановіч, *Сацыяльна-эканамічнае развіццё Валовельскай гміны ў 1921-1939 гг.*, [у:] *Берасцейскі хранограф: зборнік навуковых прац*, выпуск 4, Брэст 2004, с. 62.

чаргу іх вайсковыя заслугі і лаяльнасць да польскага панавання на гэтых землях, і толькі потым іх здольнасць займацца сельскай гаспадаркаю.

Падбіралі і размяркоўвалі асаднікаў сістэмна. Уся займаемая пад асады зямля, а таксама бліжэйшыя тэрыторыі разбіваюцца на сектары, пры чым „улічваецца вайсковы профіль". Ніжэйшае звяно кіруецца афіцэрам, які таксама жыве тут жа — у асадзе. Далей ідуць гмінныя, павятовыя і акруговыя арганізацыі. Паміж гэтымі арганізацыямі існуе пастаянная сувязь і дысцыпліна як у войску, рэгулярна праводзяцца вайсковыя заняткі. Асаднікі падпарадкаваны вышэйшаму вайсковаму камандаванню і трымаюць непасрэдную сувязь з часцямі войск, якія расквартараваны паблізу[34].

Трэба адзначыць таксама незадаволенасць часткі вайсковых асаднікаў адносінамі да іх мясцовых улад — „Gazeta Warszawska" 27 сакавіка 1931 г. апублікавала ліст асаднікаў з Планца (Косаўскі павет) „першаму асадніку" — „Скарга легіянераў-асаднікаў Пілсудскаму", у якім яны пісалі, што мясцовая адміністрацыя забараняе ім прымаць удзел у грамадскім жыцці, але пры праверцы гэтай скаргі польскімі ўладамі зроблена выснова, што скарга не адпавядае рэчаіснасці[35].

Аддзел грамадскай бяспекі філіі „Саюза асаднікаў" Палескага ваяводства дакладна кантраляваў маральную ўстойлівасць і палітычны настрой членаў арганізацыі, але нягледзячы на такую актыўную дзейнасць мясцовых вайсковых асаднікаў, палескі ваявода ў сваёй справаздачы аб грамадска-палітычным становішчы на даверанай яму тэрыторыі за першы квартал 1929 г. адзначаў, што вайсковае асадніцтва страціла свой былы ўплыў на заходнебеларускіх землях і аказалася адхіленым ад свайго кіруючага становішча ў гаспадарчым жыцці краю[36].

Варта падкрэсліць, што асаднікі сумесна з паліцыяй разганялі мітынгі і сходы, сазваныя беларускімі дэпутатамі Сейма Другой Рэчы Паспалітай. Так, 6 мая 1924 г. імі быў сарваны мітынг у Пружанах, 8 мая — у Даўгінаве, дзе збіралася болей чым па 2000 чалавек, а 25 мая — зноў у Пружанах[37]. У 1924 г. асаднікі і найбольш заможныя сяляне, спецыяльна сабраныя з навакольных вёсак Пружанскага, Косаўскага і Драгічынскага паветаў, разагналі мітынг сялян, сазваны пасламі Сейма ў мястэчку Картуз-Бяроза Пружанскага павета[38]. Падчас прамовы пасла Валошына група асаднікаў пачала свістаць, тупаць нагамі, пхацца праз натоўп да трыбуны, але дэлегаты сходу стаялі разам, не прапускаючы

[34] Л. Гак, *Аграрная палітыка польскай буржуазіі ў Заходняй Беларусі*, с. 40.
[35] В. Утгоф, *Общественные организации осадников...*, с. 145;
[36] Там жа, с. 145-146.
[37] А. А. Сорокин, *Аграрный вопрос в Западной Белоруссии...*, с. 75.
[38] Л. Гак, *Аграрная палітыка польскай буржуазіі ў Заходняй Беларусі*, с. 49.

асаднікаў да трыбуны. Тады нападаючыя, у якіх на рукавах і фуражках былі чырвона-белыя кукарды, разбіліся на невялікія групы па 10-15 чалавек, з камандай старшага па чыну, і пачалі біць удзельнікаў сходу. На гэтае неправамернае дзеянне асаднікаў беларускімі пасламі пададзены быў пратэст у Сейм Рэчы Паспалітай.

На пачатак 1930-х гг. „Саюз асаднікаў" адышоў ад актыўнай грамадска-палітычнай дзейнасці і яшчэ больш увагі стаў надаваць гаспадарчаму жыццю. Так, напрыклад, частка асаднікаў здавала свае землі ў арэнду мясцовым сялянам — гэта давала каланістам магчымасць працягваць несці вайсковую службу, працаваць у банку, на пошце, чыгунцы.

У лістападзе 1932 г. палескі ваявода Вацлаў Костак-Бярнацкі згадваў, што „Саюз асаднікаў" належыць да найбольш „энергічных" аб'яднанняў, колькасць аддзелаў якіх пастаянна расце. Управа „Саюза" штомесячна публікавала справаздачы аб дзейнасці сярод мясцовага насельніцтва ў сваёй газеце „Rozkaz" („Загад"), а з 1935 г. пачалося выданне штомесячнага інфармацыйна-агітацыйнага часопіса „Nasza Kronika" („Наша хроніка")[39].

Сяляне-палешукі заўсёды запрашалі мясцовых асаднікаў на свае святы і ўрачыстасці — найперш за ўсё на вяселлі — даючы асаднікам пачэсныя месцы ў першых радах. Многія вайсковыя асаднікі бралі шлюб з мясцовымі сялянкамі, дзеці асаднікаў і простых сялян гадаваліся разам. У 1925 г. прадстаўнік Міністэрства спраў вайсковых пры Драгічынскім павятовым надаўчым камітэце пісаў: „Стасункі асаднікаў з мясцовым насельніцтвам характарызуюцца як надзвычай добрыя... Прамовы некаторых паслоў Сейма аб так званых з'явах выразу нянавісці да асаднікаў і падаваемыя за барацьбу з асаднікамі не могуць мець трывалых каранёў сярод народных мас"[40]. Такім чынам узаемаадносіны сялян Палескага ваяводства з вайсковымі асаднікамі ў 1921-1939 гг. былі станоўчымі, нават паважлівымі і добразычлівымі.

З 1935 г. кожную вясну „Саюз асаднікаў" праводзіў свята песні, музыкі і спорту: першае такое свята было праведзена ў Варшаве, а затым у Вільні, Роўне, у 1938 г. такое свята праведзена ў Брэсце-Бужскім, апошняе „зялёнае свята" мела месца 27-29 мая 1939 г. у Гродне. У святкаванні, якое карысталася сярод заходнебеларускага сялянства вялікай папулярнасцю, прымалі ўдзел больш за 1400 чалавек з ліку перш за ўсё вайсковых і цывільных асаднікаў з усіх заходнебеларускіх ваяводстваў (у тым ліку і з Палескага), членаў „агніскаў" (асадніцкіх моладзевых арганізацый) з „усходніх ускраін", а таксама прадстаўнікі ўла-

[39] В. Утгоф, *Общественные организации осадников...*, с. 145.

[40] J. Stobniak-Smogorzewska, *Kresowe osadnictwo wojskowe 1920-1945*, s. 220, 226.

ды, мясцовае насельніцтва і запрошаныя госці з іншых рэгіёнаў краіны, часам і замежныя дэлегацыі.

У мэтах асабістай бяспекі вайсковыя асаднікі сяліліся супольна хутарамі, мелі права насіць і валодаць зброяй — кожны асаднік меў халодную зброю, вінтоўку і рэвальвер, а па чутках нават ручныя кулямёты — усе меры перадасцярогі не былі дарэмнымі, бо назіраліся выпадкі разгрому асад і памешчыцкіх маёнткаў партызанскімі атрадамі: напрыклад, 19 чэрвеня 1922 г. партызанамі спалены маёнтак Добрае Дрэва Лунінецкай гміны Лунінецкага павета, вёскі Беразное і Дубянец, а ў ноч на 26 жніўня 1923 г. разгромлены паліцэйскі ўчастак, гмінная ўправа і асада ў мястэчку Целяханы Косаўскага павета; 24 верасня 1924 г. маёнтак Юзефуў Беразноўскай гміны Пінскага павета; у ноч з 2 на 3 кастрычніка 1924 г. партызанскі атрад спаліў маёнтак і атакаваў пастарунак у Кажан-Гарадку Столінскага павета[41].

Мяркуючы па архіўных звестках, якія захаваліся і дайшлі да нас, найбольш паспяхова насаджэнне вайсковага асадніцтва ішло ў Брэст-Бужскім (Брэсцкім) павеце — на канец 1931 г. тут было 25 асад і 197 каланістаў, у 1936 г. — адпаведна ўжо 29 і 193, у 1937 г. — 25 і 204. Выклікана гэта было лепшай якасцю тутэйшай зямлі і блізкасцю Брэста-Бужскага (Брэста) — эканамічнага, адміністратыўнага і культурнага цэнтра павета і ўсяго Палескага ваяводства. На кожнага асадніка ў Палескім ваяводстве ў сярэднім прыпадала 23,7 га, дзеля параўнання ў той жа час у Віленскім — 16,5 га, у Навагрудскім — 18,5 га. Большыя надзелы асаднікаў Палескага ваяводства можна растлумачыць нізкай якасцю выдзяляемай ім тут сельскагаспадарчай зямлі.

Дакладныя даныя аб колькасці вайсковых асаднікаў на тэрыторыі Палескага ваяводства прыведзены ў табліцы №2.

Разам з вайсковымі польскія ўлады ўсяляк заахвочвалі перасяленне сюды і цывільных (грамадскіх) асаднікаў, якія займалі тут пасады чыноўнікаў і настаўнікаў, але гэты працэс у параўнанні з насаджэннем вайсковага асадніцтва не набыў такога маштабу і размаху. Неабходна падкрэсліць, што вядомы тагачасны дзяржаўны і палітычны дзеяч Другой Рэчы Паспалітай, былы валынскі ваявода Станіслаў Сракоўскі адзначаў у сваёй кнізе „Uwagi o Kresach Wschodnich” („Заўвагі аб Крэсах Усходніх”): „Вайсковыя асаднікі трымаюцца асабняком, нават у адно-

[41] В. Хвірысцюк, *Палескае ваяводства ў 1920-1925 гг.: міжнацыянальныя дачыненні і палітычнае становішча*, [у:] *Загароддзе-2. Матэрыялы навукова-краязнаўчай канферэнцыі „Палессе — скрыжаванне культур і часу” 25-27 верасня 1999*, Пінск — Мінск 2000, с. 27; В. А. Полуян, И. В. Полуян, *Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920-1939 гг.*, Минск 1962, с. 68.

**Табліца № 2: Колькасны і якасны склад вайсковых асаднікаў Палескага ваяводства (па паветах), 1931 г.**[42]

| павет | колькасць асаднікаў | колькасць асад | асаднікаў на 1 асаду (у сярэднім) | асад з болей 20 асаднікаў |
|---|---|---|---|---|
| Брэст-Бужскі | 197 | 25 | 7,9 | ? |
| Драгічынскі | 178 | 16 | 11,1 | 3 |
| Камень-Кашырскі | 123 | 10 | 12,3 | 2 |
| Кобрынскі | 97 | 14 | 6,9 | - |
| Косава-Палескі | 118 | 11 | 10,7 | 1 |
| Пружанскі | 140 | 12 | 11,7 | 2 |
| Лунінецкі і Столінскі | 137 | 15 | 9,1 | ? |
| Разам | 1146 | 119 | 9,7 | 8 |

сінах да цывільных каланістаў, падкрэсліваючы свой вайсковы характар і ўяўляючы сябе прывілеяваным казацтвам"[43].

Некаторыя цывільныя асаднікі потым нават перайшлі ў вайсковае асадніцтва (табліца № 3 )

**Табліца № 3: Вайсковае асадніцтва на тэрыторыі Палескага ваяводства (1937 г.)**[44]

| павет | колькасць асаднікаў | вайсковых з самага пачатку | перайшло з цывільных |
|---|---|---|---|
| Брэст-Бужскі | 204 | 202 | 2 |
| Драгічынскі | 182 | 181 | 1 |
| Кобрынскі | 105 | 105 | - |
| Косаўскі | 117 | 117 | - |
| Камень-Кашырскі | 138 | 136 | 2 |
| Лунінецкі | 6 | 6 | - |
| Пінскі | 158 | 158 | - |
| Пружанскі | 142 | 142 | - |
| Столінскі | 74 | 74 | - |
| Усяго | 1116 | 1111 | 5 |

Падводзячы вынікі, трэба адзначыць, што аграрная рэформа польскіх улад у 1921-1939 гг. на тэрыторыі Заходняй Беларусі характарызавалася перш за ўсё масавым насаджэннем асадніцтва — так, за азнача-

[42] J. Stobniak-Smogorzewska, *Kresowe osadnictwo wojskowe 1920-1945*, s. 105.

[43] С. Грэсь, *Цывільнае асадніцтва Рэчы Паспалітай і яго месца ў аграрнай рэформе польскага ўрада*, [у:] *Шлях да ўзаемнасці. Матэрыялы X Міжнароднай навуковай канферэнцыі: Гродна — Мір, 24 кастрычніка 2002 г.*, Гродна 2004, с. 171.

[44] *Sprawozdanie Wojewody Poleskiego na Posiedzenie Rady Wojewódzkiej w grudniu 1937 r.*, Brześć nad Bugiem 1937, s. 15.

ны перыяд на тэрыторыі Палескага ваяводства зямлю атрымалі каля 1120 вайсковых асаднікаў, якім улады перадалі ворныя землі, што ў выніку першай сусветнай і польска-савецкай 1919-1920 гг. войн, засталіся без гаспадара.

Асаднікі былі аб'яднаны ў „Саюз асаднікаў" („Саюз былых абаронцаў усходніх ускраін") з цэнтрам у г. Варшава і адной з філій у Палескім ваяводстве. Часцей за ўсё яны выконвалі абавязкі солтысаў, войтаў, засядацеляў, вялі актыўную гаспадарчую і грамадска-палітычную дзейнасць сярод мясцовага сялянства, і такім чынам сталі сацыяльнай і палітычнай апорай панавання польскіх улад на „Крэсах Усходніх", супрацьвагай уплыву тут камуністаў, актыўнымі барацьбітамі з партызанамі.

На канферэнцыі ваяводаў і начальнікаў зямельных аддзелаў у г. Гродне 24 красавіка 1937 г. генерал Чэслаў Янушкевіч запэўніваў прысутных: „Мы павінны ясна ўсведамляць, што без умацавання польскага элемента немагчыма весці барацьбу за ўсходнія землі. Найбольш рашучым саюзнікам у гэтай барацьбе будзе вясковы асаднік. Хто сядзе на зямлю, таго ніхто не скіне... Таму трэба як мага больш іх адбіраць з Цэнтральнай Польшчы. Патрэбна ствараць моцныя аб'яднанні з забяспечаных людзей, павінных супрацьстаяць нацыянальнаму руху і камуністычным заклікам. (...) Польская культура павінна гаспадарыць на паўночна-ўсходніх ускраінах"[45].

Такім чынам, вайсковыя асаднікі выступалі ў Палескім ваяводстве ў 1921-1939 гг. у якасці яскрава акрэсленага польскага каланізацыйнага элемента, але ацэньваць іх ролю ў гісторыі Палесся адназначна негатыўна нельга, бо яны ўнеслі свой значны ўклад у паляпшэнне метадаў вядзення сялянамі Палескага ваяводства гаспадаркі, у павышэнне іх агульнаадукацыйнага і культурнага ўзроўню дзякуючы адкрыццю тут школ, бібліятэк, народных дамоў, заснаванню тэатральных, музычных і спартыўных таварыстваў, правядзенню сярод мясцовага насельніцтва розных спаборніцтваў, конкурсаў, арганізацыі выставаў.

**Streszczenie**

Artykuł poświęcony jest działalności osadników wojskowych w województwie poleskim w latach 1921-1939 wśród miejscowej ludności. W historiografii sowieckiej działalność osadników oceniano jednoznacznie negatywnie, podkreślano „eksploatację gospodarczą chłopów zachodniobiałoruskich przez polskich osadników" oraz nieliczne przykłady ich niemoralnych zachowań: pijaństwo, oszukaństwo itd., przemilczano bądź marginalizowano ich aktywną działalność społeczno-polityczną. Wśród prac okresu sowieckiego na szczególną uwagę zasługują publikacje Ł. Gaka, F. Kona, B. Kucharowa, I. Połujana, A. Sorokina i innych

[45] С. М. Грэсь, *Насаджэнне асадніцтва на землях Заходняй Беларусі...*, с. 253; А. А. Сорокин, *Аграрный вопрос в Западной Белоруссии...*, с. 71.

historyków, w których z przyczyn ideologicznych działalność osadników wojskowych na Polesiu została ukazana w negatywnym świetle. W podobny sposób traktowała ją ówczesna historiografia polska.

Całkiem inne podejście do działalności osadników wojskowych na obszarze województwa poleskiego w omawianym okresie prezentują współcześni badacze polscy: w pierwszym rzędzie J. Stobniak-Smogorzewska, która pierwsza poświęciła „osadnikom kresowym" oddzielne opracowanie. Interesujące jest to, że sama J. Stobniak-Smogorzewska jest córką jednego z „kresowych osadników wojskowych" i dlatego na własne oczy widziała życie oraz działalność wojskowych i cywilnych osadników na Kresach Wschodnich, dzięki czemu jej praca naukowa stała się bardzo cennym i przydatnym źródłem do badania tego tematu.

Wśród współczesnych historyków białoruskich nadal trwa dyskusja na temat oceny położenia Białorusi Zachodniej w składzie II Rzeczypospolitej (1921-1939): jedni historycy — na przykład S. Grześ — kontynuują tradycje sowieckiej szkoły historycznej i negatywnie odnoszą się do polityki rolnej rządu polskiego na ziemiach Zachodniej Białorusi w omawianym okresie i w pierwszym rzędzie do działalności miejscowych osadników wojskowych.

Inni historycy — U. Zdanowicz, P. Zieliński, T. Kalesnikowicz, W. Uthof i inni — reprezentują narodowy punkt widzenia historii Zachodniej Białorusi pod panowaniem Polski (1921-1939). W ich pracach działalność osadników wojskowych również postrzegana jest jako jedno z głównych przedsięwzięć polskiej polityki kolonizacyjnej, ale równocześnie podkreśla się pozytywny wpływ osadników wojskowych na rozwój rolnictwa.

Autor artykułu postawił sobie za cel ukazanie gospodarczego i społeczno-politycznego charakteru działalności osadników wojskowych w województwie poleskim w latach 1921-1939, ocenienie tej działności oraz ukazanie jej znaczenia w dalszym społeczno-gospodarczym rozwoju kraju. Według autora, nie zważając na to, że osadnicy wojskowi odgrywali w województwie poleskim rolę polskiego elementu kolonizacyjnego, to jednak byli w stanie w znacznym stopniu podnieść ogólny poziom gospodarowania i kultury wśród miejscowych chłopów, z którymi stosunki wzjemne przeważnie układały się poprawnie.